# Зруйнаваць, каб не забыць

## Чаму немцы захоўваюць памяць пра Берлінскую сцяну

Многае ў свой час было чута-перачута як ідэалагічна-хвалебнага, так і змрочна-трагічнага пра адзін з найбольш знакавых сімвалаў багатага на славутасці Берліна. Але так блізка пазнаёміцца з Берлінскай сцяной выпала толькі нядаўна, у час паездкі ў германскую сталіцу, якую для нас, беларускіх журналістаў, арганізаваў Мінскі міжнародны адукацыйны цэнтр імя Ё. Рау.
Так, немцы зруйнавалі сцяну, якая некалі падзяляла іх на два супрацьлеглыя сацыяльна-ідэалагічныя лагеры. І знішчылі, трэба спадзявацца, беззваротна. Але вось парадокс: Берлінская сцяна па-ранейшаму з'яўляецца адной з самых галоўных адметнасцей германскай сталіцы – аб ёй памятаюць, пра яе расказваюць, яе, зрэшты, тут проста... паказваюць.

Наш экскурсавод элегантная Ангела Крэлер, як толькі мы выйшлі з гасцініцы, размешчанай на берлінскай Бернаўэрштрасэ, прапанавала ўсім больш уважліва паглядзець сабе пад ногі. І адразу кожны з нас запрыкмеціў даволі ёмкую па шырыні металічную палоску, пракладзеную ўздоўж тратуара. Ёю, як патлумачыла фрау Ангела, немцы пазначылі якраз тое месца, дзе некалі праходзіла Берлінская сцяна. Прычым гэтая стужка, дзе металічная, а дзе і выкладзеная з кавалкаў адмысловага бруку, уецца па германскай сталіцы па ўсім 45-кіламетровым працягу колішняй раздзяляльнай лініі і тым самым нагадвае пра вельмі няпросты перыяд у гісторыі Германіі другой паловы XX стагоддзя.

▼ Салдаты арміі ГДР узводзяць Берлінскую сцяну. 1961 год



Берлінская сцяна паўстала ў 1961 годзе. З яе дапамогай кіраўніцтва тагачаснай ГДР спрабавала спыніць масавыя ўцёкі жыхароў краіны развітога сацыялізму на тэрыторыю «наскрозь прагнілага» капіталістычнага Заходняга Берліна. Справа ў тым, што першыя гады пасля заканчэння вайны мяжа паміж усходняй і заходняй часткамі Берліна існавала намінальна. Яе свабодна маглі перасякаць колькі заўгодна разоў на дзень жыхары абедзвюх частак. Заходні Берлін афіцыйна не належаў ФРГ – ён быў самастойнай тэрытарыяльна-адміністрацыйнай адзінкай, утворанай на тэрыторыі амерыканскага, французскага і брытанскага акупацыйных сектараў, аднак меў ад яе моцную фінансавую падтрымку і, натуральна, больш высокі жыццёвы ўзровень. Усходні Берлін – сталіца ГДР – пахваліцца такім узроўнем жыцця не мог. Таму многія ўсходнегерманскія жыхары атрымлівалі ў ГДР бясплатную адукацыю, а працаваць ехалі ў Заходні Берлін. Існуе статыстыка – штодзённа ў 1950-я гады берлінскую мяжу перасякала да 100 тысяч чалавек.

Далей-болей: самыя прабітныя ўсходнія немцы – у пераважнай большасці моладзь, высокакваліфікаваныя і таленавітыя людзі – сталі мяняць месца жыхарства на Заходні Берлін. Ва ўсходняй частцы заставаліся пенсіянеры, таму што сацыяльнае забеспячэнне ў ГДР было пастаўлена вельмі добра. Усё гэта абцяжарвала дзяржаўны бюджэт сацыялістычнай Германіі: тыя, хто павінен быў працаваць, з'язджалі, а тыя, хто не працаваў, заставаліся. Існаваў і ідэалагічны бок гэтай праблемы: што гэта за дзяржава рабочых і сялян, з якой тыя ж рабочыя і сяляне ўцякаюць?..

У пачатку 1960-х гадоў гэта тэндэнцыя набрала вялікія абароты, і, каб не дапусціць масавага пераезду ў Заходні Берлін і далей у ФРГ сваіх жыхароў (паводле афіцыйных звестак, у перыяд з 1949 і да пачатку жніўня 1961 года сацыялістычную Германію пакінулі звыш 3 млн чалавек), кіраўніцтва ГДР мусіла прымаць нейкія меры.

– Берлінская сцяна з'явілася для жыхароў абедзвюх частак горада нечакана, – гаворыць Ангела Крэлер. – У ноч на 13 жніўня 1961 года ўсяго за некалькі гадзін па ўсёй мяжы паўстала загарода з калючага дроту (для гэтага спатрэбілася 150 тон калючага дроту і 18 тысяч бетонных слупоў, якія ўлады ГДР тайна завезлі з Румыніі і Польшчы), пасля чаго былі спынены ўсялякія зносіны паміж усходняй і заходняй часткамі горада. Сцяна стала сімвалам расколу не толькі Берліна, але і Германіі, Еўропы ў цэлым, яна ўвасабляла і супрацьстаянне двух ваенна-палітычных блокаў – НАТА і Арганізацыі Варшаўскага дагавора…

Гэтае збудаванне існавала больш за 28 гадоў і ўяўляла сабой моцна ахоўваемы ваенны аб'ект – да 3,6 метра ў вышыню, з сістэмай патрульных вышак, кантрольна-следавай паласой, загародай з калючага дроту, а на асобных участках – нават з супрацьтанкавымі рвамі. За час свайго існавання Берлінская сцяна некалькі разоў перабудоўвалася і ўдасканальвалася.



▲ Берлінская сцяна ў раёне Брандэнбургскіх варот. 1970-я гады

Афіцыйна грамадзяне ГДР маглі трапіць на другі бок Берлінскай сцяны толькі на падставе адмысловага дазволу, выдадзенага спецыяльным дзяржаўным органам краіны. Але працэс яго атрымання быў дастаткова доўгі і мудрагелісты. Дый выдавалі такую візу далёка не ўсім. Маладым асобам, у адрозненне ад пенсіянераў, выезд у Заходні Берлін быў наогул забаронены. Менавіта таму пераважна моладзь і імкнулася пераадолець загараджальную лінію нелегальна, і многім смельчакам (паводле некаторых






◀▼Знакамітае фота моманту ўцёкаў у Заходні Берлін салдата арміі ГДР Конрада Шумана і арыгінальны помнік гэтай падзеі

звестак, больш як 5 тыс. чалавек) гэта ўдалося зрабіць.

Берлінская вуліца Бернаўэрштрасэ ў гэтым плане мела сваю адметнасць – па ёй размежавальная лінія праходзіла літаральна па фасадах дамоў. Сам будынак афіцыйна знаходзіўся ў сталіцы ГДР, а тратуар каля яго ўжо належаў Заходняму Берліну. У першыя дні пасля ночы 13 жніўня 1961 года ўсходнія берлінцы праз вокны першага паверха размешчаных на Бернаўэрштрасэ дамоў пранікалі на Захад. Калі ж вокны ніжэйшых паверхаў заклалі цэглай, то яны, нягледзячы на магчымасць атрымаць калецтвы, скакалі з вышыні. Даволі часта такім уцекачам на дапамогу прыходзілі пажарныя з Заходняга Берліна, якія ставілі ўпрытык да дома аўтавышкі альбо разгортвалі нацяжныя выратавальныя тэнты. Як толькі гэта выявілася, то ўсіх жыхароў дамоў па Бернаўэрштрасэ выселілі, а з цягам часу разбурылі і самі будынкі, стварыўшы на іх месцы моцна ахаваную 150-метровую пагранічную паласу.

Але і пасля гэтага «транзіт на Захад» тут не спыніўся. Пад Бернаўэрштрасэ з заходнеберлінскага напрамку пачалі капаць тунэлі – за ўвесь час існавання Берлінскай сцяны было зроблена некалькі дзясяткаў такіх падкопаў. Праўда, іх даволі хутка рассакрэчвалі спецслужбы ГДР, тым не менш многія ўцёкі аказваліся паспяховымі. Напрыклад, праз 130-метровы тунэль, што пракапаў разам са сваімі аднадумцамі былы жыхар Усходняга Берліна Хаса Гершэль дзеля перапраўкі на Захад сваіх сяброў і сваякоў, у верасні 1962 года змаглі ўцячы адразу 29 чалавек.

З кожным годам пераадолець Берлінскую сцяну станавілася ўсё больш складана і небяспечна, бо вайскоўцам было аддадзены загад страляць ва ўцекачоў на паражэнне. Па сённяшні дзень не існуе поўных даных наконт колькасці ахвяр пры спробе пераадолення Берлінскай сцяны. Дакументальна пацверджана гібель 125 чалавек, але многія даследчыкі сцвярджаюць, што загінуўшых было як мінімум у чатыры разы больш. Дарэчы, імёны ўсіх 125 загінуўшых вядомыя, і памяць пра іх захоўваецца не толькі ў архівах і музейных экспазіцыях, але і непасрэдна на месцы гібелі – проста на тратуары ўманціраваны памятныя пліты з іх імёнамі. А на той жа Бернаўэрштрасэ яшчэ ў сярэдзіне 1960-х гадоў жыхарамі Заходняга Берліна быў устаноўлены мемарыяльны помнік-валун, на якім высечаны каля дзясятка прозвішчаў уцекачоў, якія загінулі пры спробе пераадолець «паласу смерці» ў раёне гэтай вуліцы.

Між тым сёння амаль уся Бернаўэрштрасэ з'яўляецца суцэльным мемарыялам. На гэтай вуліцы знаходзіцца помнік Берлінскай сцяне. Ён быў узведзены ў 1998 годзе «як напамін пра раскол горада з 13 жніўня 1961 да 9 лістапада 1989 года і як памяць пра ахвяр камуністычнай тыраніі». Акурат тут спецыяльна быў захаваны 60-метровы ўчастак «паласы смерці»




▼ Памятны знак загінуўшым пры перасячэнні Берлінскай сцяны ў раёне вуліцы Бернаўэрштрасэ ўстаноўлены заходнеберлінцамі яшчэ ў 1962 годзе




▶ Такімі мемарыяльнымі плітамі, умураванымі ў тратуар Бернаўэрштрасэ, усходнія берлінцы ўшанавалі памяць загінуўшых пасля падзення Берлінскай сцяны

з поўнай яе інфраструктурай – бетоннай сцяной, загародай з калючага дроту, кантрольна-следавай паласой, вышкай і іншым ахоўным рыштункам. Побач знаходзяцца «Капліца прымірэння», узведзеная на падмурках узарванай у 1985 годзе ўладамі ГДР евангелічнай царквы, і Цэнтр дакументацыі, дзе захоўваюцца шматлікія сведчанні пра ўвесь трагізм існавання Берлінскай сцяны.

Матэрыялы Цэнтра – сапраўдная скарбніца для журналіста. Які з іх ні вазьмі – у кожным свая гісторыя, за якой – лёс канкрэтнага чалавека. Вось прыклад. У адным з прыгарадаў Усходняга Берліна жыла сям’я ўрача Гросмана, кліентамі якога былі жыхары абедзвюх частак германскай сталіцы. У памятную ноч на 13 жніўня 1961 года ўздоўж агароджы сядзібы Гросманаў праклалі калючы дрот, а яе гаспадару забаранілі займацца ўрачэбнай практыкай. Аднак доктар па-ранейшаму працягваў лекаваць сваіх пастаянных пацыентаў з Заходняга Берліна, перакідваючы рэцэпты і запіскі з парадамі нават праз узведзеную ў хуткім часе больш як 3-метровую сцяну.

Удзячныя пацыенты арганізавалі для свайго доктара ўцёкі – падагналі да сцяны аўтамабіль, на які той павінен быў скокнуць. Аднак гер Гросман быў ужо ва ўзросце, і замест яго на Захад уцёк сын. Дачка ж Рэната не захацела пакідаць бацьку. Яна працягвала вучыцца ў адной з ВНУ Усходняга Берліна і не думала пра ўцёкі да той пары, пакуль на Захадзе не апынуўся яе каханы хлопец. І толькі пасля гэтага яны разам сталі шукаць выйсце з сітуацыі: дамовіліся сустрэцца ў Балгарыі, куды Рэната павінна была паехаць па турыстычнай пуцёўцы і адтуль па фіктыўным пашпарце ўцячы разам з каханым у ФРГ. Аднак за ёй па наводцы ўсходнегерманскіх спецслужбаў быў наладжаны пільны кантроль іх балгарскіх калег, і ў выніку пры спробе перасекчы мяжу дзяўчыну арыштавалі. Балгарскі следчы быў вельмі настойлівы, не хацеў пераводзіць арыштантку ў ГДР. Аднак у рэшце рэшт нічога зрабіць так і не мог – на развітанне Рэната паабяцала, што яшчэ прышле яму свой вясельны фотаздымак. У ГДР дзяўчыну змясцілі ў турму, але яна ведала – прыйдзе час і яе выкупяць. Такую практыку прыдумалі ўсходнегерманскія спецслужбы. Урэшце каханы хлопец заплаціў 100 тысяч заходнегерманскіх марак, і Рэнату вызвалілі і перапраўлі ў ФРГ.

У хуткім часе маладыя згулялі вяселле. І тады, як абяцала Рэната, яна выслала фотаздымак свайму былому следчаму ў Балгарыю. Але той зноў праявіў прынцыповасць і звярнуўся да кіраўніцтва з заявай, што мяккацелыя ўсходнегерманскія следчыя дапускаюць выкуп палітвязняў. Сведчанне таму – вясельны здымак Р. Гросман. Пасля гэтага справа пачала раскручвацца далей, вестка пра выкуп атрымала шырокі розгалас, і германскі бок мусіў спыніць практыку платнай перапраўкі вязняў у Заходні Берлін.




▲ Памятныя стэнды на Бернаўэрштрасэ, якія расказваюць пра Берлінскую сцяну, і металічная палоска, пракладзеная на тым месцы, дзе некалі праходзіла раздзяляльная мяжа

▼ На месцы былой 150-метровай зоны адчужэння на Бернаўэрштрасэ цяпер ўзводзяцца новыя будынкі – офісы, атэлі, рэстараны



Гэта, вядома, не пайшло на карысць абодвум бакам. Між тым існуе легенда, што перад навагоднімі святамі ўлады ГДР асабліва актыўна абменьвалі вязняў на пастаўку ў краіну розных далікатэсаў. Кажуць, быў выпадак, што за вагон апельсінаў арыштаванага за спробу ўцячы ў Заходні Берлін з асаблівым шанаваннем пераправілі ў ФРГ.

Самымі ж вядомымі сталі ўцёкі ў жніўні 1961 года – на трэці дзень будаўніцтва сцяны – маладога салдата арміі ГДР Конрада Шумана. 15 жніўня ён нёс службу ля часовай агароджы з калючага дроту, дзе пазней вырасла сцяна. Купкі маладых жыхароў Заходняга Берліна, стоячы насупраць Шумана, выкрыквалі розныя кпіны ў яго адрас. Калі яны ўбачылі, што салдат пільна ўглядаецца ў заслону з калючага дроту, сталі падбіваць яго да ўцёкаў. Іх заклікі актывізаваліся, калі пад'ехала і прыпынілася паліцэйская машына з адчыненымі заднімі дзвярамі. І тады Шуман імкліва зрабіў некалькі крокаў і пераскочыў дрот. Пасля чаго хутка сеў у паліцэйскую машыну і знік.  Уцёк салдата ГДР (у той час, калі ён пераадольваў у скачку перашкоду) зафіксаваў заходнегерманскі фатограф Петэр Лэйбінг, які выпадкова апынуўся на месцы падзей. Праз колькі гадзін яго здымак з'явіўся на вокладцы заходнегерманскага часопіса «Більд», а Конрад Шуман у адначассе стаў вядомы на ўвесь свет.

Пазней першы ўцякач з Заходняга Берліна перабраўся ў ФРГ, ажаніўся і жыў з сям'ёй у Баварыі, працаваў аўтаслесарам і доўгія гады апасаўся помсты з боку спецслужбаў ГДР. І толькі 9 лістапада 1989 года, калі пачаўся працэс аб'яднання Заходняй і Усходняй Германіі, ён афіцыйна заявіў журналістам, што сапраўды адчувае сябе свабодным. Праўда, далейшы лёс яго склаўся трагічна – у 1998 годзе Конрад Шуман, які моцна пакутаваў ад дэпрэсіі, наклаў на сябе рукі.

Экспазіцыя Цэнтра дакументацыі мемарыяла «Берлінская сцяна» расказвае і пра іншыя выпадкі, часам кур'ёзныя, а часцей – трагічныя, пераадольвання Берлінскай сцяны. Так, праз год пасля ўсталявання сцяны яе адважыўся пераадолець 18-гадовы юнак Петэр Фехтэр. 17 жніўня 1962 года ён вырашыў пералезці праз сцяну непадалёк ад кантрольна-прапускнога пункта «Чэкпойнт Чарлі». Заўважыўшы ўцекача, усходнегерманскія пагранічнікі без папярэджання пачалі па ім страляць. У выніку цяжка паранены Петэр зваліўся на нейтральную паласу і не мог рухацца. Ён ляжаў і прасіў паратунку. Але ні пагранічнікі ГДР, ні заходнеберлінскія паліцэйскія, ні шматлікія відавочцы гэтага здарэння так і не прыйшлі яму на дапамогу. І толькі праз некалькі гадзін, калі ад страты крыві юнак памёр, яго цела забралі салдаты арміі ГДР. У той жа дзень жыхары Заходняга Берліна ўшанавалі яго памяць, а само імя Петэра Фехтэра стала сімвалам ахвярнасці тых, хто загінуў пры спробе ўцячы праз Берлінскую сцяну. На месцы яго гібелі ўстаноўлены помнік, каля якога заўсёды ляжаць жывыя кветкі.

Былі і паспяховыя спробы пераадолення сцяны, для чаго ўцекачы вышуквалі самыя розныя спосабы. У першыя гады існавання Берлінскай сцяны было зафіксавана з дзясятак выпадкаў, калі перашкоду таранілі грузавікамі. Пасля перад ёй былі ўстаноўлены стальныя шыпы. Некалькі разоў адважныя смельчакі на спартыўных аўтамабілях з нізкай пасадкай праслізгвалі пад шлагбаўмам таго ж самага «Чэкпойнт Чарлі». У чэрвені 1962 года 14 чалавек захапілі буксір, які хадзіў па рацэ Шпрэе, і пад шквалам кулямётнага агню паспяхова перапраравіліся на ім у Заходні Берлін.

Вядома каля 60 выпадкаў уцёкаў па паветры. У 1973 годзе шматразовы чэмпіён ГДР па планернаму спорту Уда Эльке пераляцеў праз граніцу на фанерным безматорным самалёце непасрэдна ў час спаборніцтваў. А ў 1979 годзе ўсходнегерманскія сем'і Ветцэль і Стрэльцэк выправіліся на Захад на паветраным шары, змайстраваным з розных

**▼ Берлінская сцяна ўжо не тоіць пагрозы. Радасць усходніх берлінцаў. Лістапад 1989 года**



дапаможных прылад і матэрыялаў. Уцёкі ім удаліся, а рэшткі таго паветранага шара цяпер у якасці экспаната захоўваюцца ў мемарыяле Берлінскай сцяны.

Найбольш дзёрзкімі ў гісторыі пераадолення Берлінскай сцяны лічацца здзейсненыя ў 1965 годзе ўцёкі сям'і ўсходнегерманскага эканаміста Хайнца Хольцапфеля. Працуючы ў «Доме міністраў» – высотным будынку, дзе знаходзілася каля дзясятка міністэрстваў ГДР, ён ведаў, што адна сцяна гэтай пабудовы ўшчыльную падыходзіць да лініі размежавання. Таму і зарадзіўся ў яго незвычайны план уцёкаў. Аднаго разу незадоўга да заканчэння працоўнага дня Хайнц правёў у будынак жонку і сына. Разам яны падняліся на апошні паверх і закрыліся ў прыбіральні, папярэдне павесіўшы на яе дзвярах таблічку аб тым тым, што «ўстанова» не працуе па тэхнічных прычынах. Ноччу сямейнікі прабраліся на дах. Пасля гэтага Хайнц замацаваў у тарцы будынка вяроўку, а затым другі яе канец з прымацаваным і загадзя нацёртым фосфарам малатком, каб свяціўся, перакінуў на суседні дом, які размяшчаўся на заходнеберлінскім баку і дзе, згодна з дамоўленасцю, іх чакалі сваякі. Як толькі вяроўка была нацягнута і замацавана, Хайнц пасадзіў у няхітрае прыстасаванне з невялічкім колам сына, і той, як на фанікулёры, за лічаныя секунды апынуўся ў Заходнім Берліне. Затым такім жа чынам туды трапілі жонка і сам Хольцапфель. У гэтым выпадку цікава і тое, што з самага пачатку «аперацыі на даху» за імі наглядаў ахоўнік, але не падаў сігналу трывогі – наіўна думаў, што гэта перапраўляюцца на Захад агенты спецслужбаў.

Нам пашчасціла сустрэцца і непасрэдна з адным з вязняў берлінскай палітычнай турмы. Вядомы сёння пісьменнік і журналіст Карл-Хайнц Рыхтэр разам з сябрамі наладзіў уцёкі з ГДР своеасаблівым шляхам – яны пры поўным ходзе цягніка, які накіроўваўся з Усходняга Берліна ў Заходні, скакалі на прыступку вагона і так траплялі ў Заходні Берлін.

– Зрабіць гэта было ўдвая небяспечна, – гаворыць гер Карл. – Спачатку трэба было непрыкметна наблізіцца да чыгуначнага палатна, якое, між іншым, ахоўвалася. Затым, як мага шчыльней прыцiснуўшыся да зямлі, даводзілася чакаць, пакуль з'явіцца цягнік. А ён імчаў вельмі хутка. Нягледзячы на гэта, ты падымаешся і бяжыш яму насустрач, на



▲ Дэмантаж Берлінскай сцяны ў раёне Брандэнбургскіх варот. 1990 год

ходу хапаешся за поручань – цябе адразу моцна б'е аб вагон. Але трэба ўтрымацца на падножцы, затым вельмі хутка адчыніць дзверы вагона і трапіць у сярэдзіну. Калі прамарудзіш, лічы, расквітаўся з жыццём: прыкмеціўшы ўцекача, ахова адкрывала агонь на паражэнне. Мой сябар Вольфганг уцёк першым. І пасля па аднаму я пераправіў такім чынам 17 чалавек. Вольфганг штовечар прыходзіў на чыгуначны вакзал Заходняга Берліна і на пероне чакаў чарговага ўцекача. Заходнеберлінскае радыё кожны раз паведамляла пра ўдалы ўцёк, і, праслухаўшы такое паведамленне, я шчыра радаваўся, што яшчэ аднаму нашаму сябру ўдалося ўцячы…

Калі ж настала чарга Карла, то яго спасцігла няўдача. Дзверы вагона былі зачыненыя на ключ, і, не змогшы іх адчыніць, ён мусіў скочыць з цягніка – інакш бы атрымаў кулю. Падчас падзення ён моцна пакалечыўся, але і з пераломам нагі змог дабрацца дадому. Спачатку лекаваўся самастойна, але хтосьці выдаў паліцыі, і яго, яшчэ нездаровага, арыштавалі. Доўгі час Карл правёў у турме, затым стаў дысідэнтам, якога аднак улады так і не выдварылі з краіны. Пасля аб'яднання Германіі Карл-Хайнц Рыхтэр напісаў некалькі кніг, пра яго зняты фільм «Уцёкі на экспрэсе «Масква – Парыж». Ёсць у яго і яшчэ адзін занятак – Карл-Хайнц Рыхтэр праводзіць экскурсіі ў мемарыяльным комплексе «Хоэншонхаўзэн», створаным на месцы былой турмы Міністэрства дзяржбяспекі ГДР («Штазі»). Слухаеш аповед гэтага чалавека і не перастаеш здзіўляцца яго мужнасці і адвазе.

Больш за дзве гадзіны вадзіла нас фрау Крэлер па знакамітай берлінскай вуліцы. Расказвала многія цікавосткі, прыводзіла шмат фактаў, дзялілася ўласнымі ўспамінамі пра перыяд існавання Берлінскай сцяны. Паводле яе асабістага прызнання, 9 лістапада 1989 года ў жыцці немцаў і яе асабістым – надзвычай важная дата. Якраз у гэты дзень Берлінская сцяна перастала быць грозным фарпостам. Пасля гэтага яна яшчэ пэўны час стаяла – з вялікімі і малымі прабоінамі-праходамі, распісаная шматлікімі графіці, малюнкамі і надпісамі, берлінцы і наведвальнікі горада імкнуліся забраць на памяць кавалкі, адбітыя ад некалі магутнага збудавання. Дарэчы, сёння ў Берліне тыя ж самыя кавалачкі паўсюдна прадаюцца ўжо ў якасці сувеніраў. Амаль праз год пасля гэтага – 3 кастрычніка 1990 года – адбылося і доўгачаканае для ўсіх немцаў аб'яднанне Усходняй і Заходняй Германіі, і ўжо новае германскае кіраўніцтва прыняло рашэнне аб дэмантажы Берлінскай сцяны, што і было зроблена за некалькі месяцаў. Толькі асобныя невялікія яе часткі вырашылі захаваць як напамін для наступных пакаленняў. Усе падзеі, звязаныя з падзеннем сцяны і аб'яднаннем Германіі, суправаджаліся ўсенароднай радасцю…

Праўда, для жыхароў былой ГДР насталі няпростыя часы прыстасоўвання да новых сацыяльна-эканамічных умоў у аб'яднанай Германіі. І працэс гэты, як ні дзіўна, доўжыцца і цяпер, што прызнаюць на самым высокім дзяржаўным узроўні. Прынамсі, канцлер ФРГ Ангела Меркель неаднаразова падкрэслівала, што ўсходнія немцы, насуперак дадзеным у свой час кіраўніцтвам краіны абяцанням, пакуль яшчэ не дасягнулі таго жыццёвага ўзроўню, які маюць жыхары заходніх федэральных зямель. Для стабілізацыі сітуацыі ўрад Германіі накіроўвае ў былую ГДР вялізныя фінансавыя сродкі. Дзеля гэтага ў 1991 годзе быў нават уведзены так званы «падатак на салідарнасць», які спаганяецца з нямецкіх падаткаплацельшчыкаў – як юрыдычных, так і фізічных асоб, зарэгістраваных у заходняй частцы краіны, – у памеры 5,5 % ад іх даходаў. І штогод такім чынам дзяржаўнай казне дадаткова ўдаецца сабраць у сярэднім крыху больш за 10 млрд еўра. Дзякуючы і гэтым фінансавым уліванням сёння ва ўсходняй частцы Германіі імклівымі тэмпамі развіваецца сфера вытворчасці прадуктаў харчавання, металаапрацоўка, машынабудаванне, хімічная і электратэхнічная прамысловасць.

Тым не менш у германскім грамадстве да гэтага часу не прыйшлі да адзінай думкі, хто выйграў ад аб'яднання дзвюх дзяржаў, а хто прайграў. Калі верыць даным сацыялагічнага апытання, праведзенага некалькі гадоў таму адным з інфармацыйных агенцтваў Германіі, 60 % рэспандэнтаў заходніх федэральных зямель лічаць, што ад аб'яднання выйгралі, перш за ўсё, усходнія немцы, і толькі 7 % выказаліся на карысць пэўных выгод, якія атрымалі ад гэтага працэсу жыхары колішняй ФРГ. Як паказалі вынікі таго ж даследавання ў былой ГДР, там кожны чацвёрты рэспандэнт сцвярджаў, што ў першую чаргу ад аб'яднання краіны выйгралі заходнія немцы. Разам з тым 84 % апытаных у розных рэгіёнах Германіі далі станоўчы адказ на пытанне, ці задаволены яны працэсам аб'яднання краіны, а пра сваё расчараванне сітуацыяй заявілі толькі 14 % рэспандэнтаў.

…Мінула ўжо чвэрць стагоддзя, як знікла Берлінская сцяна. І хоць яна перастала існаваць як фізічны бар'ер, у германскім грамадстве не забыліся пра гэты сімвал халоднай вайны і супрацьстаяння ідэалогій наогул. Дый рабіць гэта немцы зусім не збіраюцца. Берлінская сцяна для іх – гэта не толькі памяць пра ГДРаўскае мінулае, але і напамін аб тым, што было і чаго забываць нельга.

**Сяргей ГАЛОЎКА**
**Мінск – Берлін – Мінск**
**Фота аўтара і архіўныя**

▼**Адна з захаваных невялікіх частак Берлінскай сцяны адначасова з'яўляецца і мастацкай галерэяй пад адкрытым небам**

